# ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ

## ЯК ПАМІРАЮЦЬ ДРЭВЫ

На схіле берага, ускрай Ялты, вялікі адмежак шызай зямлі трэснуў і аб’ехаў.

Зямля апаўзла акурат на дарозе, што ідзе над морам; доўгая паласа дарогі асела, пакрывілася, і асфальт разарвала, – усцяж відна павілястая, з зубамі, трэшчына. Разламала, пакрывіла і цэментавы бар’ер з боку мора. Трэснуў моцны, са сцэментаванага камення падмурак пад прыгожай драўлянай будкай-павільёнам, і яна таксама нахілілася крыва, падатна. Яе ўжо разбіраюць рабочыя.

Бераг, мусіць, аб’язджае паволі і цяпер, але воку відно ўсё нерухомым. І ўсё ж гэта ўражвае нядобра: уражвае асабліва, мусіць, таму, што за ўсім гэтым адчуваецца вялікая, магутная сіла разбурэння. Ад гэтага ў душу лезе адчуванне няпэўнасці, няцвёрдасці, трывогі.

І, можа, таму хвалюе іншае; кусты і дрэвы зелянеюць, нібы нічога кепскага не было і быць не можа. Вясна, і на кустах квецень, а на квецені пчолы. Усё ў звычайным клопаце, усё жыве… Асабліва хвалююць тры сасны: апоўзень нахіліў іх, яшчэ трохі – і яны зваляцца, – але колькі годнасці, велічы ў іх паставах. Як весела зіхацяць яны пад сонцам, над бліскотным, чамусьці радасным морам.

*Іван Мележ*

*1966*